http://edoc.bseu.by

# СУДОВАЕ РАШЭННЕ Ў ПРАЦАХ ІВАНА ФАЙНІЦКАГА

Д. В. Грынь

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Іван Якаўлевіч Файніцкі (1847 — 1913) – вядомы дарэвалюцыйны рускі навуковец-крыміналіст, выкладчык, які 40 год працаваў у Санкт-Пецярбургскім Імператарскім універсітэце, ураджэнец беларускага Гомеля. Яго даследчыцкая і выкладчыцкая кар’ера фарміравалася пад уплывам другога нашага славутага земляка, У.Д. Спасовіча ўжо ў паслярэформенны перыяд. У навуцы крымінальнага працэсу асаблівую ўвагу Файніцкі надаваў праблемам забеспячэння гарантый правоў асобы як на стадыі папярэдняга следства, так і судовага разбору, дзейнасці суда прысяжных, рэалізацыі права на абарону і г.д. Значны ўклад І.Я. Файніцкі ўнёс у навуку крымінальнага права. Тэмы яго даследаванняў тычыліся як Агульнай, так і Асаблівай часткі, пераважна закраналіся такія пытанні, як маёмасныя злачынствы, вучэнне аб саўдзеле, пакаранне і яго прызначэнне і інш. Вынікі яго даследаванняў аказалі ўплыў не толькі на заканадаўства і правапрымяняльную практыку таго часу, — шмат якія з іх актуальны па сённяшні дзень. Пацвярджэннем з’яўляецца адлюстраванне ідэй І.Я. Файніцкага у сучасным крымінальным заканадаўстве.

Мэта даследавання – вывучэнне навукова-даследчыцкай дзейнасці І.Я. Файніцкага, вызначэнне ўплыву яго работ на правапрымяняльную практыку Беларусі.

І.Я. Файніцкі апублікаваў шэраг фундаментальных прац у галіне крымінальнага права і працэсу: «Учение о наказании в связи с тюрьмоведением» (1889) [3], «Курс уголовного права. Часть особенная», дзе ўпершыню была праведзена навуковая распрацоўка сістэмы Асаблівай часткі крымінальнага права (падручнік вытрымаў пяць прыжыццёвых выданняў: першае – 1890 г., апошняе – 1912 г.), якая ўяўляе цікавасць як для тэарэтыкаў, так і для практыкаў. Асабліва трэба адзначыць «Курс уголовного судопроизводства» [1; 2] ў двух тамах, якія вытрымаў чатыры дарэвалюцыйныя выданні і перавыдадзены ў нашы дні.

Адной з самых галоўных катэгорый крымінальна-працэсуальнага права з’яўляецца катэгорыя «судовае рашэнне». Судовыя рашэнні – гэта прынятыя ў парадку і формах, прадугледжаных Крымінальна-працэсуальным кодэксам, акты правапрымянення, якія змяшчаюць уладнае волевыяўленне суда, а таксама накіраваныя на абарону ў канкрэтнай справе правоў і законных інтарэсаў асобы, грамадства, дзяржавы. І. Я. Файніцкі пісаў пра тое, што «к постановке судебного решения направляются все процессуальные меры, все действия суда и сторон, оно есть заключительное звено процесса, та цель, к которой стремится все судебное разбирательство» [2, с. 340]. З гэтага вынікае, што судовае рашэнне змяшчае ўсе адказы на пытанні, якія ўзніклі ў

крымінальнай справе. «Судебное решение отвечает на возникший в деле вопрос, разрешает его и таким образом для отдельного частного случая создает закон…» [2, с. 341].

Файніцкі выдзяляў асноўныя ўласцівасці судовага рашэння, такія як:

– належная кампетэнцыя суда па вынясенню рашэння (падсуднасць дадзенага пытання суду, які выносіць рашэнне, і разгляд яго ва ўстаноўленым законам парадку);

– законнасць гэтага рашэння – матэрыяльная і фармальная. Пад матэрыяльнай законнасцю прадугледжвалася правільнае прымяненне нормаў матэрыяльнага права «согласие вынесенного судом ответа с законом по существу тех мер, которые устанавливаются судебным решением… ответ суда, предписывающий какие-нибудь меры, невозможные физически или юридически, не может устанавливать понятие судебного решения» [2, с. 341]. Фармальная законнасць прадугледжвае захаванне працэсуальнага парадку пастановы дадзенага рашэння;

– матываванасць рашэння – «всякое судебное решение должно содержать в себе мотивы или соображения, на которых оно основано» [2, с. 341], – гэта істотна адрознівае яго ад адміністрацыйных распараджэнняў;

– справядлівасць рашэння па сутнасці справы;

– абавязковасць выканання для асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Прысуды Файніцкі падзяляе на абвінаваўчыя, апраўдальныя і пасрэдніцкія – аб пакіданні ў падазрэнні (дадзены тып прысуду быў аднесены аўтарам да гістарычных тыпаў, якія практычна не ўжываліся ў той час). Аналізуючы прысуд аб пакіданні ў падазрэнні, вучоны пісаў пра тое, што ён выносіўся тады, калі суд імкнуўся перш за ўсё да матэрыяльнай праўды, інтарэсы якой ставіліся вышэй практычных інтарэсаў, якія ўзнікаюць у крымінальнай справе.

У залежнасці ад сілы дзеяння, прысуды падзяляліся на канчатковыя і неканчатковыя. Неканчатковы прысуды дапускаюць магчымасць іх перагляду па сутнасці асноўнага пытання аб вінаватасці і пакаранні. Канчатковыя прысуды – гэта прысуды, якія могуць быць перагледжаны не па сутнасці фактычных абставінаў справы, а толькі па пытанні законнасці альбо незаконнасці іх пастановы.

Патрабаванні да судовага рашэння, аб якіх пісаў выдатны вучоны стагоддзе таму назад, не толькі не страцілі актуальнасці, але і былі замацаваны на заканадаўчым узроўні: арт. 8 КПК Рэспублікі Беларусь вызначае, што рашэнні ў крымінальным судаводстве павінны быць законнымі, абгрунтаванымі і матываванымі [1, с. 164].

І. Я. Файніцкі, аналізуючы феномен судовай улады, вылучаў такія яе прыкметы, як:

– знешняя самастойнасць «отправление судебных функций независимо от каких бы то ни было посторонних ведомств или лиц, сообразно закону и истинным интересам правосудия» [1, с. 164];

– прымяненне і тлумачэнне закона ў прымяненні да асобных выпадкаў сапраўднага жыцця;

– адсутнасць нарматворчасці (судовае тлумачэнне «сводится к решению двух вопросов: существует ли известная норма, обнимает ли она данный вопрос или случай, решению подлежащий» [1, с. 165]);

– дзеянне закона «у межах канкрэтна вызначанай справы», якая падлягае вырашэнню;

– роўнасць судоў у тлумачэнні права – у аднолькавым аб'ёме і аднолькавай юрыдычнай сіле (канчатковыя рашэнні кожнай судовай інстанцыі маюць аднолькавую сілу);

– папаўненне працэсуальных нормаў (прымяненне іх па аналогіі);

– рэалізацыя задачы аховы правоў дзяржавы, грамадства і асобы «ограждения прав, законом дарованных», против всех нарушителей их» [1, с. 165];

– паўната судовай улады (магчымасць ажыццяўлення судовай дзейнасці, сапраўднай вытворчасці судовых дзеянняў і ажыццяўлення судовых рашэнняў незалежна ад іншых уладаў);

– унутраная самастойнасць «плод твердого убеждения и высокой безупречной нравственности» [1, с. 165]).

Вывучаючы ідэі І.Я. Файніцкага пра ўласцівасці судовай улады і асаблівасці судовых рашэнняў у крымінальным працэсе ў дачыненні да сучасных умоў, прыходзім да высновы аб тым, што да найважнейшых прыкметаў судовага рашэння можна аднесці: самастойны і незалежны характар; распаўсюджванне на канкрэтную прававаую спрэчку; аб'ектыўнасць; прымусовасць; рэгулятыўны і правапрымяняльны характар.

Ідэі І.Я. Файніцкага аб сутнасці, відах і ўласцівасцях судовых рашэнняў за стагоддзе ў сучасных умовах набылі асаблівае значэнне. У першую чаргу гэта тычыцца ўласцівасці судовых рашэнняў з'яўляцца сродкамі рэалізацыі судовай улады. У сучасных умовах, калі патрабуецца павышэнне аўтарытэту, незалежнасці і самастойнасці судовай улады, рашэнні суда, у тым ліку і тыя, што прымаюцца ў ходзе вытворчасці па крымінальных справах, з'яўляюцца індыкатарам, які вызначае эфектыўнасць правасуддзя. Працы расейскага навукоўца ніколі не былі даследаваннямі толькі рускага права: яны належалі сусветнай юрыдычнай думцы.

Такім чынам, І.Я. Файніцкім за сто гадоў да прыняцця дзеючага ў Рэспубліцы Беларусь Крымінальнага кодэкса былі сфармуляваны палажэнні, якія змяшчаюцца ў арт. 62 КК Рэспублікі Беларусь 1999 года: больш строгі від пакарання з ліку прадугледжаных за ўчыненае злачынства прызначаецца толькі ў выпадку, калі менш строгі від пакарання не зможа забяспечыць дасягненне мэт пакарання [4].

«Курс крымінальнага судаводства» І. Я. Файніцкага з'яўляецца свайго рода сувязным звяном паміж цяперашнімі пераўтварэннямі і вялікай судовай рэформай 1864 г., ідэалы якой ён заўсёды адстойваў і развіваў. Не барацьба з ворагамі знешнімі і ўнутранымі, але стварэнне справядлівага правасуддзя «для

всех равного, безволокитного и неразорительного» [1, с. 41] – гэтая задача была важная для дзяржавы тады, важная яна і сёння, і менавіта гэтаму прысвяціў сваё жыццё і працы выдатны расійскі навуковец з беларускімі каранямі Іван Якаўлевіч Файніцкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Фойницкий, И. Я. Курс уголовного судопроизводства / И. Я. Фойницкий. – СПб. : Альфа, 1996. – Т. 1. – 552 с.
2. Фойницкий И. Я. Курс уголовного судопроизводства / И. Я. Фойницкий. – СПб. : Альфа, 1996. – Т. 2. – 607 с.
3. Фойницкий, И. Я. Учение о наказании в связи с тюрьмоведением / И. Я. Фойницкий. – СПб. : Тип. М-ва путей сообщения,1898. – 317 с.
4. Уголовный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 9 июля 1999 г., № 275-З : принят Палатой представителей 2 июня 1999 г. : одоб. Советом Респ. 24 июня 1999 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.